## ДАВЫДАВА НІНА МАКСІМАЎНА



**Месца нараджэння:** в. Гушчына, Шумілінскі раён

**Дата нараджэння:** 30.03.1922

**Дата смерці:** жнівень 1943

**Месца подзвігу:** Шумілінскі раён, чыгуначная станцыя Обаль

**Дата подзвігу:** 1943

**Ушанаванне:** Віцебская вобл., Шумілінскі р-н, г. п. Обаль – вуліца

У 1942 годзе ўступіла ў падпольную арганізацыю «Юныя мсціўцы». Амаль кожны вечар падпольшчыкі прымалі па радыё зводкі Саўінфармбюро, ад рукі перапісвалі іх, і сотні людзей з Обалі і навакольных вёсак даведваліся пра сапраўднае становішча на франтах, гераізм савецкіх воінаў. Ніна ўладкавалася працаваць у афіцэрскую сталовую. Яна добра ведала нямецкую мову. Яна атрымлівала каштоўныя звесткі пра планы і намеры гітлераўцаў. Апошнім заданнем Ніны было атруціць фашысцкіх афіцэраў. Заданне было выканана. У выніку дыверсіі загінула больш ста гітлераўскіх афіцэраў. Ніна была арыштавана і пасля катаванняў расстраляна.

За мужнасць, праяўленую ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў, Давыдава Ніна Максімаўна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Яе імем названа вуліца ў г. п. Обаль Шумілінскага раёна.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Давыдова** Нина Максимовна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 174.

2. **Давыдова** Нина Максимовна // Память : историко-документальная хроника Шумилинского района / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.] ; худож. А. Н. Хилькевич. – Минск, 1985. – С. 90.

3. **Краўчанка, Н.** Подзвіг Ніны Давыдавай / Н. Краўчанка // Віцебскі рабочы. – 1975. – 3 ліп. – С. 2.

4. **Мезенка, Г. М.** Давыдавай вуліца / Г. М. Мезенка // Віцебшчына ў назвах вуліц : манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск, 2008. – Ч. 2. – С. 40.

**Давыдова** Нина Максимовна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 174.

**ДАВЫДОВА НИНА МАКСИМОВНА (30.03.1922 – 1943)**

Участница партизанского движения на территории Витебской области в годы Великой Отечественной войны.

Родилась в д. Гущино (ныне в черте г. п. Оболь) Шумилинского р-на Витебской области. Член ВЛКСМ. Окончила Обольскую среднюю школу, где после окончания педагогических курсов при Полоцком педучилище работала учителем. С января 1942 г. – член Обольской подпольной комсомольской организации «Юные мстители». По заданию комсомольской организации устроилась официанткой в немецкую офицерскую столовую Обольского гарнизона. Зная немецкий язык, узнавала и передавала партизанам ценные сведения, помогавшие им организовывать диверсии на вражеских объектах. С ее помощью в Обольском гарнизоне уничтожены зондерфюрер СС и три сопровождавших его офицера. После очередной крупной диверсии в конце лета 1943 года направлялась в партизанский отряд им. К. Е. Ворошилова бригады им. С. М. Короткина, но была схвачена фашистами и после пыток расстреляна. Посмертно награждена орденом Отечественной войны I степени.

Именем Н. М. Давыдовой названа улица в г. п. Оболь, там же создан музей комсомольской славы и установлен памятник членам подпольной организации «Юные мстители».

**Краўчанка, Н.** Подзвіг Ніны Давыдавай / Н. Краўчанка // Віцебскі рабочы. — 1975. — 3 ліп. – С. 2.

## ПОДЗВІГ НІНЫ ДАВЫДАВАЙ

«За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў, узнагародзіць ордэнам Айчыннай вайны I ступені Давыдаву Ніну Максімаўну (пасмяротна)…».

Прайшоў яшчэ адзін дзень. Прыхіліўшыся да сцяны турэмнай камеры, Ніна ўспамінала апошнія гады свайго жыцця. Вайна застала яе ў Ваўкавыску, дзе яна працавала настаўніцай у школе. Ніна, як і многія іншыя савецкія людзі, адправілася на ўсход. Але уцячы ад фашыстаў не ўдалося. Пасля доўгіх вандраванняў дзяўчына вярнулася на радзіму, у Обаль. А летам 1942 года ўступіла ў падпольную арганізацыю «Юныя мсціўцы».

Часта вечарамі падпольшчыкі прымалі па радыё зводкі Саўінфармбюро, ад рукі перапісвалі іх, і кожны раз сотні людзей з Обалі і навакольных вёсак ведалі праўду аб становішчы на франтах, аб гераізме савецкіх воінаў. Ніна ўладкавалася працаваць у афіцэрскую сталовую. Яна добра ведала нямецкую мову. Ёй удавалася даведацца многа каштоўнага аб планах, намерах гітлераўцаў.

Атруціць фашысцкіх афіцэраў – гэта было апошнім заданнем Ніны. Выканаць яго яна павінна была разам са сваёй стрыечнай сястрой Зінай Партновай, якая таксама працавала ў сталовай. З партызанскага атрада пераслалі яд. Захоўваць яго было небяспечна, і Зіна пашыла ляльку, схаваўшы ў яе слоік з ядам. Лялька некалькі дзён ляжала сярод многіх іншых цацак яе малодшай сястры Галі. Ніну папярэдзілі, каб яна была цяпер асабліва асцярожнай. Падысці да катлоў было практычна немагчыма. І ўсё ж такі выпадак падвярнуўся. У той дзень захварэла мыйшчыца посуду, і на яе месца паставілі сціплую, працавітую дзяўчыну Зіну Партнову. Ніна падбегла да акна з посудам і па сумнаму твару Зіны здагадалася, што ўсё можа сарвацца. Шэфповар не адыходзіў ад катлоў. Заставалася адно – выклікаць яго ў залу. Але як гэта зрабіць? Хутка ў зале раздаўся шум. Адзін з афіцэраў рабіў вымову Ніне Давыдавай за дрэнна прыгатаваны абед. Па патрабаванню афіцэра яна выклікала галоўнага повара ў залу. Гэта выкарыстала Зіна.

Заданне было выканана. У выніку дыверсіі загінула больш ста гітлераўскіх афіцэраў. Зіне ўдалося ўцячы. Але Ніна была арыштавана. І вось ужо некалькі дзён ідуць допыты, катаванні…

Надышла цяжкая жнівеньская раніца. Яна была апошняй у жыцці Ніны Давыдавай. А праз некалькі дзён падпольшчыца Ніна Азоліна перадала таварышам, што Ніна вытрымала ўсе катаванні, нікога не выдала і памёрла, як сапраўдны савецкі чалавек.